учные конференции «Типология и взаимодействие славянских языков и литератур». В 1990-е гг. систематически стали проводиться международные конференции «Славянские литературы в контексте мировой», в центре внимания которых – взаимодействие и взаимосвязь русской литературы с другими литературами мира.

Перечисленные работы (далеко не все) свидетельствуют о широком круге исследуемых проблем по русской литературе, об их актуальности и литературоведческой значимости. Подводя итоги, приведем статистические данные: только за последние пять лет по проблемам русской литературы было защищено три докторских диссертации, 12 кандидатских, издано шесть монографий, 10 учебных пособий, написано 230 статей, сделано 120 докладов на международных конференциях и конгрессах. При этом следует отметить приоритет монографий и учебных пособий наших белорусских исследователей по современной русской прозе и драматургии, их систематизации, что признано в литературоведческой науке. Это свидетельствует о динамике научных исследований и о том, что русистика в Беларуси находится на уровне современных требований.

*Т.І. ШАМЯКІНА*

## НА НІВЕ БЕЛАРУСАЗНАЎСТВА

The paper describes the stages of foundation and development of Belarusistics as a scientific direction and an academic discipline at the Belarusian State University.



***Шамякіна Таццяна Іванаўна*** – кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры беларусазнаўства (з 2000 г.). Аўтар звыш 100 публікацый, сярод якіх кнігі "На лініі перасячэння" (1981), "Міфалогія Беларусі" (2000). Сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі. Займаецца мастацкім перакладам. Навуковыя інтарэсы: беларуская літаратура і культура ў кантэксце сусветнага літаратурнага і культурнага працэсаў.

Курс "Беларусазнаўства" быў уведзены ў ВНУ Беларусі яшчэ ў 20-я гг. XX ст., у перыяд так званай "першай беларусізацыі" ў маладой савецкай рэспубліцы. Праграма курса, знойдзеная ў архіве, прадугледжвае заняткі па беларускай мове і літаратуры, гісторыі, геаграфіі, этнаграфіі, гісторыі рэвалюцыйнага руху. Рашэнне аб утварэнні кафедры ва універсітэце было прынята спецыяльнай Пастановай Міністэрства адукацыі 29 ліпеня 1989 г. на новай хвалі актыўнай беларусізацыі. Першапачатковая назва кафедры – "кафедра беларускай мовы і літаратуры для прыродазнаўчых факультэтаў". Калектыў, які ўзначаліў кандыдат філалагічных навук, дацэнт, сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі У.А. Навумовіч, паставіў сваёй асноўнай мэтай далучэнне студэнтаў прыродазнаўчых факультэтаў да найбагацейшых скарбаў мовы, літаратуры, фальклору беларускага народа, засяродзіў першаступенную ўвагу на выпуску тэрміналагічных слоўнікаў па біялогіі, фізіцы, матэматыцы, геаграфіі, гісторыі, хіміі і іншах галінах навукі. Падрыхтаваны спецыяльныя вучэбныя праграмы, рабочыя планы.

У мэтах пашырэння прэстыжу і аўтарытэту беларускай мовы ў свеце па ініцыятыве загадчыка кафедры пры Беларускім дзяржаўным універсітэце пачала працаваць "Міжнародная школа беларускай мовы, літаратуры і культуры". За 1990–1994 гг. на працягу летніх месяцаў слухачамі школы сталі



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

вучоныя-славісты, студэнты з Аўстрыі, Вялікабрытаніі, Германіі, Егіпта, Італіі, ЗША, Канады, Польшчы, Расіі, Славеніі, Украіны, Швейцарыі, Францыі, Японіі. У 1992 г. кафедра была перайменавана ў кафедру беларусазнаўства. Беларусазнаўства – інтэгральная вучэбная дысцыпліна, прысвечаная гісторыі і культуры грамадства. Былі падрыхтаваны Праграмы па беларусазнаўству для студэнтаў ВНУ, пад рэдакцыяй П.І. Брыгадзіна выпушчаны ў свет навучальны дапаможнік "Беларусазнаўства" (1998), распрацаваны новыя курсы і спецкурсы.

На кафедры абаронена доктарская дысертацыя І.В. Казаковай "Міфалагічна-фальклорная спецыфіка беларускай традыцыйнай культуры" (2000 г.), кандыдацкая дысертацыя М.К. Чаеўскай "Стыль маладой прозы Беларусі 1920-х гг. і яго сацыякультурная дэтэрмінацыя" (1992 г.). У 2000 г. было прынята рашэнне аб адмене курса "Беларусазнаўства" ў ВНУ. Загадчыкам кафедры калекгыў выбраў кандыдата філалагічных навук, дацэнта Т.І. Шамякіну. На працягу 2000/2001 навучальнага года ішла пераарыентацыя кафедры ў накірунку этналінгвакультуралогіі, міфалінгвакраіназнаўства.

Сёння яе навукоўцы выкладаюць курс сучаснай беларускай мовы (прафесійная лексіка) на ўсіх прыродазнаўчых факультэтах БДУ, чытаюцца курсы па беларускай лексікалогіі і навуковай тэрміналогіі. На філалагічным факультэце кафедра забяспечвае чытанне курса "Усходнеславянская міфалогія" і "Тэорыя і гісторыя сусветнай культуры".

Супрацоўнікі кафедры падрыхтавалі грунтоўныя навуковыя манаграфіі: "Этнічныя традыцыі ў духоўнай культуры беларусаў" (1995), "Міфалагемы і магія ў беларускім абрадавым фальклоры" (1997), "Сімволіка і семантыка славянскіх міфалагем (на матэрыяле беларускага фальклору)" (1999) І.В. Казаковай, "Беларуская класічная літаратурная традыцыя і міфалогія" (2001) Т.І. Шамякінай; выдадзены падручнікі "Беларусазнаўства" (1998), "Гісторыя беларускай літаратуры" для сярэдніх навучальных устаноў У.А. Навумовіча, "Беларуская літаратура XI–XX ст. Для ліцэяў, каледжаў, ВНУ" (2-е выд.) Т.І. Шамякінай у сааўтарстве (2000), "Міфалогія Беларусі" (2000).

На кафедры распрацаваны новыя праграмы выкладання беларускай мовы на іншых (нефілалагічных) факультэтах БДУ. Праграмы прадугледжваюць: авалоданне студэнтамі культурай мовы, уласна беларускай тэрміналогіяй, засваенне пэўных ведаў з гісторыі мовы, гісторыка-этналагічны аналіз мовы, вывучэнне сугестыўных магчымасцей мовы, этнанімікі, знаёмства з асновамі семіётыкі, матэматычнымі законамі вершаскладання і г. д. Распрацаваны факультатывы: "Этнакультуралогія", "Экалогія культуры", "Гісторыя беларускай культуры". Мяркуецца максімальна ўлічваць спецыфіку факультэтаў у выкладанні беларускай мовы і факультатываў. На філалагічным факультэце плануецца чытаць курс "Культуралогія" з улікам спецыфікі філфака, а таксама спецкурсаў "Этналогія", "Этнаміфалінгвістыка", "Культура народаў Беларусі". Для магістрантаў ужо падрыхтаваны курсы "Псіхалогія творчасці. Работа пісьменніка" і "Беларуская анамастыка". Вядзецца падрыхтоўка лекцый па тэме "Культура мовы ў СМІ".

На кафедры арганізаваны тэатр-студыя "Пасад" на базе юрыдычнага факультэта і мехмата (кіраўнік – доктар філалагічных навук, дацэнт І.В. Казакова). Вялікую цікавасць у моладзі выклікаюць тэатралізаваныя прадстаўленні, у якіх студэнты прымаюць удзел, далучаюцца да традыцыйнай беларускай культуры.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm